Беларускі дзяржаўны універсітэт

Філалагічны факультэт

# ПАЛАЖЭННЕ
# АБ ДЫПЛОМНАЙ РАБОЦЕ

Для студэнтаў філалагічнага факультэта спецыяльнасцей
1-21 05 01 “Беларуская філалогія”
1-21 05 02 “Руская філалогія”
1-21 05 04 “Славянская філалогія”
1-21 05 05 “Класічная філалогія”
1-21 05 06 “Рамана-германская філалогія”
1-21 05 07 “Усходняя філалогія”

Мінск, 2010

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*Бадзевіч З. І.,* кандыдат філалагічных навук, загадчык кафедры сучаснай беларускай мовы, дацэнт;
*Казакова Т. П.,* кандыдат філалагічных навук, загадчык кафедры гісторыі беларускай літаратуры, дацэнт;
*Іванова Г. К.,* кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі беларускай мовы.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Навукова-метадычным саветам філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (пратакол № 6 ад “_3_” лютага 2010 г.);

Вучоным саветам філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (пратакол № 4 ад “__4_” лютага 2010 г.).

Адказны за рэдакцыю: З.І.Бадзевіч
Адказны за выпуск: М.М.Хмяльніцкі

## АГУЛЬНЫЯ ЗАЎВАГІ

Дыпломная работа выконваецца на заключным этапе навучання – на V курсе дзённай і на VI курсе завочнай формы навучання. Яна з'яўляецца кваліфікацыйнай: па ўзроўні яе выканання і выніках абароны Дзяржаўная экзаменацыйная камісія прымае рашэнне аб наданні выпускніку адпаведнай кваліфікацыі. Дыпломная работа – гэта абагульнены выклад уласна дасягнутых вынікаў даследавання на аснове вывучанай навуковай літаратуры па актуальных праблемах літаратуразнаўства, мовазнаўства ці методыкі выкладання мовы або літаратуры. Студэнт-выпускнік павінен прадставіць Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі самастойна падрыхтаванае завершанае даследаванне, адпаведнае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да зместу і афармлення дыпломных работ у вышэйшых навучальных установах.

Дыпломная работа афармляецца згодна існуючых арфаграфічных і пунктуацыйных нормаў (на працягу 2009 – 2010 нав. г. дзейнічаюць "Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі" (Мінск, 1959); з 1 верасня 2010 г. "Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі" (Мінск, 2008) ці "Правила русской орфографии и пунктуации. Полный академический справочник / под ред. В.В. Лопатина – М.: Эксмо, 2007).

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ

**Патрабаванні да зместу дыпломнай работы.** Ад студэнта-ды плом ні ка патрабуецца дастаткова поўна, з належнай кваліфікаванасцю раскрыць абраную тэму. У сваёй рабоце яму неабходна ў лагічнай паслядоўнасці, аргументавана і доказна выкласці змест і вынікі даследавання. Дыпломная работа павінна мець канцэптуальны характар: асноўныя палажэнні неабходна абгрунтаваць на аснове абагульнення навуковых літаратуразнаўчых, мо ва знаў чых ці педагагічных і метадычных крыніц, спасылак на іх, а таксама з дапамогай перакананальных, красамоўных прыкладаў і цытат з мастацкіх тво раў або іншых відаў тэкстаў. Змест праведзенага даследавання павінен адлю стра ваць знаёмства дыпломніка з літаратурай па абранай тэме, выявіць здоль насць студэнта да самастойнага аналізу і творчага мыслення, засведчыць пра яго належную філалагічную кампетэнцыю.

**Выбар тэмы.** Звычайна тэма дыпломнага даследавання фармулюецца і паступова распрацоўваецца падчас працы ў спецсемінары. Выбар тэмы ажыццяўляецца студэнтам разам з кіраўніком, пры гэтым студэнт павінен вызначыць сваю цікавасць да абранай лінгвістычнай, літаратуразнаўчай ці метадычнай праблемы, а кіраўнік характарызуе асаблівасці яе вырашэння, дае агульныя звесткі пра крыніцы дасладавання. На заключным этапе тэма можа ўдакладняцца. Не

выключана, што ў ходзе работы з кіраўніком будуць уносіцца карэктывы ў план і канцэпцыю работы.

Студэнт можа прапанаваць уласную тэму дыпломнай работы. У гэтым выпадку яму патрэбна звярнуцца да загадчыка кафедры з пісьмовай заявай, у якой абгрунтоўваецца мэтазгоднасць гэтага даследавання. Пры станоўчым вырашэнні пытання тэма дыпломнай работы ўключаецца ў пералік тэм кафедры.

Тэма дыпломнай работы і прызначэнне навуковага кіраўніка абмяр коў ваюцца на пасяджэнні кафедры на падставе пісьмовай заявы, пададзенай студэнтам на імя загадчыка кафедры.

Тэмы дыпломных работ, іх кіраўнікі і рэцэнзенты зацвярджаюцца загадам рэктара па прадстаўленні дэкана факультэта. У выпадку неабход насці перамены ці ўдакладнення тэмы дыпломнай работы дэкан факультэта на аснове прадстаўлення кафедры хадайнічае аб унясенні адпаведных змяненняў у загад рэктара.

**Бібліяграфія, праца з навуковымі крыніцамі**. Надзвычай важным этапам у падрыхтоўцы дыпломнай работы з'яўляецца праца па вывучэнні навуковай і мастацкай літаратуры. На першай кансультацыі выкладчык прапаноўвае бібліяграфічны спіс асноўных навуковых крыніц, якія неабходна выкарыстаць пры напісанні даследавання. Разам з тым у ходзе даследча-пошукавай дзейнасці студэнт працягвае знаёмства з навуковай літаратурай складае пашыраны бібліяграфічны спіс.

Правілы афармлення бібліяграфічнага спісу гл. *Дадатак 3.*

**План дыпломнай работы.** Агульныя абрысы плана дыпломнай работы кіраўнік абмалёўвае ўжо на першай кансультацыі. Ён прапаноўвае студэнту прыкладную канцэптуальную схему дыпломнага даследавання, якая пасля вывучэння літаратуры і заглыблення ў навуковую тэму канкрэтызуецца і ўдакладняецца. План дэталёва абмяркоўваецца з кіраўніком, карэкцiруецца і ў выніку гэтага робіцца больш лагічна вывераным і дакладным. Канчатковы варыянт плана можа лічыцца кірункам для самастойнай даследчай дзейнасці дыпломніка.

Пажадана скласці падрабязны рабочы план дыпломнай работы, дзе варта пазначыць чарговасць вылучэння і асвятлення асноўных навуковых палажэнняў, акрэсліць канкрэтныя задачы і шляхі іх рэалізацыі.

У адпаведнасці з тэмай работы кіраўнік дае студэнту індывідуальныя заданні (па вывучэнні навуковай літаратуры, зборы матэрыялу, напісанні тэксту дыпломнага сачынення), вызначае этапы працы, сочыць за тэрмінамі іх выканання. Пры неабходнасці можа быць распрацаваны каляндарны план-графік на ўвесь перыяд працы студэнта над дыпломнай работай.

**Структура і аб'ём дыпломнай работы.** Дыпломная работа складаецца з тытульнай старонкі, зместу, уводзін, дзвюх-трох глаў, заключэння і бібліяграфічнага спіса, дадатка (калі ёсць).

**Структура работы:**

- Тытульны ліст (нумар старонкі не ставіцца);
- Змест (нумар старонкі не ставіцца):
- Уводзіны ці уступ (с. 3).
- Асноўная частка структурыруецца главамі.
- Раздзелы падаюцца (калі патрэбна) у кожнай главе, напрыклад:
    2.1. – першы раздзел другой главы.
- Заключэнне.
- Бібліяграфічны спіс.
- Дадатак (калі ёсць).

**Тытульная старонка** дыпломнай работы афармляецца паводле адпаведнага ўзору (гл. *Дадатак 1*).

**Змест** уключае загалоўкі (назвы) структурных частак з пазначэннем старонак, на якіх размешчаны тэкст (гл. *Дадатак 2*).

**Уводзіны.** У гэтай структурнай частцы даецца сціслая характарыстыка аб’екта і прадмета даследавання, адзначаецца актуальнасць тэмы, абгрун тоў ваецца яе выбар, ступень даследаванасці, фармулююцца мэта дыпломнай работы і задачы, якія неабходна вырашыць для дасягнення пастаўленай мэты.

**Асноўная частка** складаецца з дзвюх і больш глаў, першая з якіх абавязкова з’яўляецца аглядам навуковых крыніц па тэме даследавання. У асноўнай частцы фармулюецца канцэпцыя работы, акрэсліваюцца праве дзе ныя тэарэтычныя і практычныя даследаванні. Вельмі важна, каб у рабоце былі адлюстраваны вынікі самастойнага даследавання з канстатацыяй фак таў, уласнымі ацэнкамі, разважаннямі, меркаваннямі. У канцы кожнага раз дзе ла варта падаваць сціслыя вывады. Падпарадкаванае мэце і задачам на вуковага пошуку асвятленне і доказнае абгрунтаванне асноўных тэарэ тыч ных палажэнняў абавязкова павінна быць праілюстравана фактычным ма тэ рыялам. Пры апісанні навуковага аналізу неабходна рабіць спасылкі на аўтараў і крыніцу запазычання той ці іншай думкі, пры гэтым вытрымкі з чужога тэксту афармляюцца ў адпаведнасці з агульнапрынятымі правіламі цытавання: [Шакун 1987, с. 26], дзе ўказваецца аўтар крыніцы, год выдання і нумар старонкі. Пры пашпартызацыі ілюстрацыйнага матэрыялу могуць выкарыстоўвацца ўмоўныя скарачэнні. Напрыклад, [ТСБМ, V – 2, с. 5]. Пры гэтым дадаецца спіс ўмоўных скарачэнняў: ТСБМ – Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5-ці тамах.

**Заключэнне** ўключае асноўныя вывады па тэме дыпломнай работы, якія карэлююць з пастаўленай мэтай і акрэсленымі задачамі, вызначаюцца навуковай аб’ектыўнасцю і доказнасцю.

**Спіс літаратуры** складаецца з дзвюх частак: “Бібліяграфічны спіс” і “Спіс публікацый дыпломніка” (калі яны маюцца). Бібліяграфія прыводзіцца напрыканцы работы і афармляецца ў адпаведнасці з агульнапрынятымі правіламі (гл. *Дадатак 3*). Крыніцы размяшчаюцца ў

алфавітным парадку паводле прозвішча аўтара ці назвы выдання. Выданні лацінскім шрыфтам падаюцца ў алфавітным парадку пасля спісу кірылічных выданняў. Напрыканцы падаецца спіс інтэрнэт-сайтаў (калі на іх рабіліся спасылкі). Пералік крыніц даецца ў суцэльнай нумарацыі. Спіс выкарыстанай літаратуры павінен змяшчаць не менш як 30 пазіцый, уключаючы выданні крыніц фактычнага матэрыялу.

Прыкладны аб’ём дыпломнай работы – 50–55 старонак камп’ютэрнага набору фармату А4. Аднак памер работы можа перавышаць вызначаныя межы на 5–10 старонак, паколькі ён залежыць ад ступені распрацаванасці тэмы (праблемы), яе шматаспектнасці, ад шырыні ахопу пытанняў і аб’ёму фактычнага матэрыялу і яго прэзентацыі (напрыклад, вершаваны паэтычны тэкст), ад творчага патэнцыялу студэнта і інш.

**Дадатак** утрымлівае дапаможны матэрыял. Ён афармляецца пры неабходнасці больш поўна падаць вынікі даследчай работы. Колькасць дадаткаў вызначаецца аўтарам самастойна. Сюды ўключаюцца: спісы моўных адзінак, табліцы, схемы, ілюстрацыі і інш.

**Мова і стыль дыпломнай работы.** Дыпломная работа павінна быць напісана навуковым стылем. Матэрыял неабходна выкладаць лагічна, паслядоўна, дакладна, пазбягаць агульных выразаў, штампаў, моўных і стылёвых памылак: таўталогіі, недакладнасці словаўжывання, парушэння сінтаксічнай сувязі і інш. Дыпломная работа павінна быць пісьменнай. Студэнт абавязаны вычытаць тэкст, зрабіць неабходныя выпраўленні, у тым ліку і памылак друку.

## АФАРМЛЕННЕ РАБОТЫ

Тэкст дыпломнай работы павінен быць набраны з дапамогай кам п’ю тэ ра і раздрукаваны на прынтэры на адным баку аркуша паперы фармату А4.

Тэкст работы набіраецца з дапамогай тэкставага рэдактара Word. Для гэтага выкарыстоўваецца шрыфт Times New Roman, 14 кегль, выраўноўванне па шырыні. Колькасць знакаў у радку павінна складаць 60–70, міжрадковы інтэрвал – **“множитель” 1,1**, колькасць радкоў на старонцы – 39–40.

Неабходна вытрымліваць наступныя памеры палёў: верхняга і ніжняга – 2 см, левага – 3 см, правага – 1 см.

Абзацны водступ – 1,25 см.

Шрыфт асноўнага тэксту павінен быць прамым, чорнага колеру, аднолькавым па ўсім тэксце работы; ілюстрацыйныя прыклады падаюцца курсівам. Для вылучэння частак тэксту дазваляецца выкарыстоўваць розныя тыпы шрыфту – тлусты, курсіў, падкрэсліванне, разрадка.

Адрукоўкі дазваляецца выпраўляць карэктарам.

Загалоўкі (назвы) структурных частак работы (ЗМЕСТ, УВОДЗІНЫ, ГЛАВА, ЗАКЛЮЧЭННЕ, БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС, ДАДАТАК)

друкуюцца вялікімі літарамі, звычайным шрыфтам 14 кеглем і змяшчаюцца па цэнтры.

Загалоўкі раздзелаў друкуюцца з абзаца малымі літарамі (акрамя першай вялікай), тлустым шрыфтам 14 кеглем.

Загалоўкі падраздзелаў друкуюцца з абзаца малымі літарамі (акрамя першай вялікай), тлустым шрыфтам 14 кеглем.

У канцы загалоўкаў глаў, раздзелаў, падраздзелаў кропка не ставіцца. Калі загаловак складаецца з некалькіх сказаў, то яны раздзяляюцца кропкай.

Адлегласць паміж назвай структурнай часткі і тэкстам, а таксама паміж тэкстам і назвай структурнай часткі работы (напрыклад, тэкст аднаго раздзела і назва другога раздзела) складае 12 пт. Калі паміж двума загалоўкамі тэкст адсутнічае (напрыклад, калі пасля назвы главы ідзе назва раздзела), то адлегласць паміж імі складае 12 пт.

Адлегласць перад загалоўкамі раздзелаў і падраздзелаў складае 24 пт.

Кожную структурную частку работы (ЗМЕСТ, УВОДЗІНЫ, ГЛАВА, ЗАКЛЮЧЭННЕ, БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС, ДАДАТАК) неабходна пачынаць з новай старонкі. Раздзелы і падраздзелы з новай старонкі не пачынаюцца.

Старонкі работы нумаруюцца арабскімі лічбамі. Першай старонкай работы з’яўляецца тытул, другой старонкай з’яўляецца змест работы, якія залічваецца ў агульную колькасць старонак, але нумар на адпаведных старонках не ставіцца. На астатніх старонках нумар абавязкова пазначаецца на верхнім полі старонкі з правага боку без кропкі.

Главы, раздзелы, падраздзелы нумаруюцца арабскімі лічбамі без знака № пасярэдзіне старонкі. Уводзіны, заключэнне, бібліяграфічны спіс арабскімі лічбамі не пазначаюцца.

Нумар главы ставіцца пасля слова ГЛАВА, напрыклад: ГЛАВА 1.

Раздзелы нумаруюцца ў межах глаў. Нумар раздзела складаецца з парадкавага нумара главы і раздзела, размежаваных кропкамі, напрыклад: 2.1. (першы раздзел другой главы).

У межах раздзелаў могуць вылучацца падраздзелы, нумараванне якіх таксама размяжоўваецца кропкамі, напрыклад: 2.1.1. (першы падраздзел першага раздзела другой главы).

Назвы раздзелаў і падраздзелаў раўняюцца па левым баку старонкі. Асноўны тэкст раздзелаў і падраздзелаў пішацца з чырвонага радка.

У канцы нумара главы, раздзела і падраздзела ставіцца кропка.

Главы і іх загалоўкі друкуюцца з новай старонкі пасля нумара главы, напрыклад:

# ГЛАВА 1. МЕТАФАРА ЯК АБ’ЕКТ НАВУКОВАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

Загалоўкі раздзелаў і падраздзелаў падаюцца пасля іх нумароў праз прабел, напрыклад:

# ГЛАВА 2. СЕМАНТЫЧНЫЯ ТЫПЫ СУБСТАНТЫЎНЫХ МЕТАФАР

## 2.1. Анімістычны тып

## 2.2. Саматычны тып

## 2.3. Тэмпаральны тып

**2.4. Лакатыўны тып** ( і г.д.).

Выдзяленне падраздзелаў у межах раздзелаў, напрыклад:

### 2.1.1. Метафары, якія характарызуюць асобу з пункту гледжання яе знешняга выгляду

### 2.1.2. Метафары, якія характарызуюць асобу з пункту гледжання яе псіхічнага складу, разумовых здольнасцей, рысаў характару

У канцы назваў загалоўкаў глаў, раздзелаў і падраздзелаў кропка не ставіцца.

Пэўная інфармацыя ў тэксце работы можа падавацца ў выглядзе ілюстрацый і табліц. Яны прыводзяцца з абзаца пасля тэксту або на асобнай старонцы пасля тэксту, у якім згадваюцца, і павінны размяшчацца так, каб было зручна іх разглядаць. На ўсе малюнкі і табліцы павінны быць спасылкі ў тэксце работы. Ілюстрацыі і табліцы абазначаюцца словамі “малюнак”, “табліца” і нумаруюцца паслядоўна ў межах главы, раздзела (падраздзела). Нумар малюнка ці табліцы складаецца з парадкавага нумара раздзела і нумара малюнка ці табліцы, напрыклад: Малюнак 2.3. (трэці малюнак другога раздзела), Табліца 1.2. (другая табліца першага раздзела). Калі ў межах главы не выдзяляюцца раздзелы і падраздзелы, то малюнкі і табліцы нумаруюцца паслядоўна ў межах главы, напрыклад: “Малюнак 1.”, “Малюнак 2.”, “Табліца 1.”, “Табліца 2.”. Пасля нумара ставіцца кропка. Кожны малюнак ці табліца павінны мець назву. Словы “малюнак”, “табліца” друкуюцца нятлустым

(звычайным) шрыфтам 12 кеглем, а назвы малюнкаў, табліц друкуюцца тлустым шрыфтам 12 кеглем і размяшчаюцца над малюнкам або табліцай справа, напрыклад:

Малюнак 1.

**Метафары, якія характарызуюць асобу з пункту гледжання яе знешняга выгляду**

Табліца 3.1.

**Частотнасць ужывання субстантыўных метафар**

| Саматычны тып | Тэмпаральны тып | Лакатыўны тып |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |

Кожная графа табліцы павінна мець назву, якая друкуецца малымі літарамі (акрамя першай вялікай).

У тэксце работы неабходна даваць спасылкі на навуковую, даведачную і мастацкую літаратуру. Пры спасылцы ў тэксце работы на адпаведную крыніцу неабходна ў квадратных дужках указаць прозвішча аўтара (першае слова назвы выдання пры калектыўным аўтарстве), год і нумар старонкі праз коску, напрыклад: [Шакун 1978, с. 123]. Цытата абавязкова бярэцца ў двукоссе. Пасля цытаты, якая заканчваецца на кропку, кропка перад закрывальным двукоссем не ставіцца – кропка ставіцца пасля квадратных дужак, напрыклад: «Вельмі рэдкімі з'яўляюцца выпадкі, калі мнагазначны дзеяслоў усімі значэннямі змяшчаецца ў адну трывальную карэляцыю» [Шуба 1987, с. 145].

Калі ж цытата ў канцы мае клічнік, пытальнік ці шматкроп'е, то яны ставяцца ў канцы цытаты перад закрывальным двукоссем.

Дыпломная работа падаецца да абароны ў пераплёце. Яна павінна быць пісьменнай, вычытанай самім студэнтам.

**Абарона дыпломнай работы.** На кафедры ствараецца камісія па правядзенні папярэдняй абароны дыпломных работ. Перадабарона адбываецца прыкладна за месяц да абароны ў Дзяржаўнай камісіі. Прысутнасць кожнага студэнта-дыпломніка абавязковая, ён павінен падаць на разгляд кафедры напрацаваныя матэрыялы па тэме свайго даследавання.

Завершаную дыпломную работу неабходна прадставіць навуковаму

кі раў ніку, які рыхтуе на яе водзыў, не пазней як за 14 дзён да абароны.

У водзыве навуковага кіраўніка дыпломнай работы павінны быць адзначаны: актуальнасць тэмы, ступень вырашанасці пастаўленай мэты, ступень самастойнасці і ініцыятыўнасці студэнта, уменне карыстацца навуковай літаратурай і здольнасць студэнта да навукова-даследчай працы, а таксама гатоўнасць работы да абароны ў Дзяржаўнай камісіі і магчымасці прысваення кваліфікацыі студэнту.

Пасля таго, як зроблены водзыў навуковага кіраўніка, дыпломная ра бота накіроўваецца на рэцэнзію.

У рэцэнзіі павінна быць адзначана актуальнасць тэмы, адпаведнасць задач пастаўленай мэце і іх метадалагічнае вырашэнне, паўната агляду навуковай літаратуры, лагічнасць выкладу матэрыялу, аргументаванасць высноў дыпломнага праекта, станоўчыя вартасці, а таксама недахопы і слабыя бакі даследавання.

Рэцэнзент прапануе Дзяржаўнай камісіі адзнаку па 10-бальнай сістэме , а таксама робіць заключэнне аб прысваенні кваліфікацыі дыпломніку.

Рэцэнзаванне дыпломнай работы адбываецца на працягу 7–10 дзён да абароны ў Дзяржаўнай камісіі. Студэнт, які своечасова здаў работу на рэ цэн за ванне, мае права азнаёміцца за 1—2 дні са зместам рэцэнзіі з тым, каб даць адказы на зробленыя заўвагі. Дыпломная работа з водзывам кіраўніка і рэцэнзіяй падаецца на разгляд загадчыку кафедры за 3 дні да абароны, які вырашае пытанне аб допуску студэнта да абароны. Допуск студэнта да абароны фіксуецца толькі подпісам загадчыка кафедры на тытульнай старонцы работы.

Абарона дыпломнай работы з’яўляецца публічнай: на ёй, апрача кіраўнікоў і рэцэнзентаў, могуць прысутнічаць прадстаўнікі рэктарата і дэканата, выкладчыкі з іншых кафедраў, студэнты. У сваім выступленні (да 10 хвілін) аўтар дыпломнай работы гаворыць пра актуальнасць тэмы, знаёміць прысутных з пастаўленай мэтай і задачамі, якія вырашаліся ў працэсе навуковага аналізу, сцісла выкладае змест і вынікі даследавання. Падчас абароны студэнту могуць быць зададзены пытанні, якія непасрэдна звязаны з тэмай яго работы або маюць апасродкаваную сувязь з ёй. Дакладнасць і глыбіня адказаў дыпломніка ўлічваецца пры агульнай ацэнцы работы. Навуковы кіраўнік мае права выказацца пра дыпломнае даследаванне і яе аўтара. Рэцэнзентам даецца агульная характарыстыка работы, пры гэтым ён ацэньвае ўзровень і якасць праведзенага даследавання, адзначае вартасці і вызначае слабыя бакі. Пасля абмеркавання камісіяй вынікаў абароны выстаўляецца адзнака, прымаецца рашэнне аб прысваенні выпускніку адпаведнай кваліфікацыі.

***Дадатак 1***
*Афармленне тытульнай старонкі дыпломнай работы*

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Філалагічны факультэт
кафедра сучаснай беларускай мовы

**МЕТАФАРА ЯК СРОДАК МАСТАЦКАЙ ВЫРАЗНАСЦІ Ў ПРАЗАІЧНЫХ ТВОРАХ ЯКУБА КОЛАСА**

Дыпломная работа
студэнткі V курса
дзённай формы навучання
спецыяльнасці «Беларуская філалогія»
Лісоўскай Кацярыны Аляксандраўны

Навуковы кіраўнік –
кандыдат філалагічных навук
дацэнт Савіцкая Ірына Іванаўна

Рэцэнзент –
кандыдат філалагічных навук
дацэнт Любецкая Кацярына Пятроўна

Мінск, 2010

***Дадатак 2***
*Афармленне зместу*

# ЗМЕСТ


УВОДЗІНЫ……………………………………………………… 3

ГЛАВА 1. МЕТАФАРА ЯК АБ’ЕКТ НАВУКОВАГА ДА СЛЕ ДА ВАННЯ...................................................................................... 9
14
14
ГЛАВА 2. СЕМАНТЫЧНЫЯ ТЫПЫ СУБСТАНТЫЎНЫХ МЕ ТАФАР.................................................................................... 20
28
2.1. Саматычны тып ..........................................................
2.2. Тэмпаральны тып ……………………………………… 35
2.3. Лакатыўны тып ……………………………………… 36
39
ГЛАВА 3. СТРУКТУРНЫЯ ТЫПЫ СУБСТАНТЫЎНЫХ МЕ ТА ФАР...................................................................................... 45
52
3. 1. Простыя метафары……………………………………... 55
3.2. Складаныя метафары……………………………………
3.3. Шматслоўныя метафары………………………………… 60
61
ЗАКЛЮЧЭННЕ…………………………………………………........

БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС..................................................................

ДАДАТАК 1. Семантычныя тыпы субстантыўных метафар ............

ДАДАТАК 2. Частотнасць ужывання метафар……………………….

*Дадатак 3*

# АФАРМЛЕННЕ БІБЛІЯГРАФІЧНАГА СПІСА

## а) Прыклады бібліяграфічнага апісання самастойных выданняў

*Адзін, два або тры аўтары*

Шамякіна Т. І. Беларуская класічная літаратурная традыцыя і міфало гія / Т. І. Шамякіна. — Мінск: БДУ, 2001. — 238 с.

Дудараў А. Князь Вітаўт: п'есы / А. Дудараў. — Мінск: Маст. літ., 2005. — 318 с.

Мішчанчук М. І. Беларуская літаратура XX стагоддзя / М. І. Мі шчан чук, І. С. Шпакоўскі. — Мінск: Вышэйш. шк., 2001. — 352 с.

Грамадчанка Т. К. Праблемы сучаснай беларускай крытыкі / Т. К. Гра мад чанка, А. С. Гурская, Л. М. Гарэлік. — Мінск: Навука і тэхніка, 1996. — 219 с.

*Чатыры і больш аўтараў*

Нарысы беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязей: культур.-гіст. і літаратуразн. аспекты праблемы / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы / М. А. Тычына [і інш.]; навук. рэд. М. А. Тычына, У. І. Мархель. — Мінск: Беларус. навука, 2002. — 383 с.

Культурология: учеб. пособие для вузов / С. В. Лапина [и др.]; под общ. ред. С. В. Лапиной. — 2-е изд. — Минск: ТетраСистемс, 2004. — 495 с.

*Калектыўны аўтар*

Уладзімір Караткевіч. Быў. Ёсць. Буду!: успаміны, інтэрв'ю, эсэ / уклад. Г. Шаблінскай. — Мінск: Маст. літ., 2005. — 518 с.

Душа мая тужлівая...: вершы, паэмы / уклад. В. Шніпа. — Мінск: Маст. літ., 2005.— 303 с.

Беларускі фальклор: энцыкл.: у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск: БелЭн, 2005. — Т. 1: Акапэла — Куцця. — 768 с.

*Шматтомнае выданне*

Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. Імя Я. Купалы; рэдкал.: У. В. Гніламёдаў [і інш.]. — Мінск: Беларус. навука, 1999—2003. — 4 т.

Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы; рэдкал.: У. В. Гніламёдаў [і інш.]. — Мінск: Беларус. навука, 1999—2003. — Т. 1: 1901—1920 / Л. Я. Гаранін [і інш.]. — 1999. — 583 с; Т. 4, кн. 1: 1966—1985 / С. А. Андраюк [і інш.]. — 2002. — 928 с.

*Купала Я.* Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. — Мінск: Маст. літ., 1995—2003.— 9 т.

*Асобны том у шматтомным выданні*

Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы; рэдкал.: У. В. Гніламёдаў [і інш.]. — Мінск: Беларус. навука, 1999—2003. — Т. 3: 1941—1965 / Г. П. Твhärановіч [і інш.]. — 2001. — 952 с.

Багдановіч М. Поўны збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч. — 2-е выд. — Мінск: Беларус. навука, 2001. — Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. — 751 с.

*Зборнікі артыкулаў, навуковых прац*

Фалькларыстычныя даследаванні: Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі: зб. арт. / пад навук. рэд. Р. М. Кавалёвай, В. В. Прыемка. — Мінск: Беспрынт, 2005. — Вып. 2. — 269 с.

Творчая асоба І. Навуменкі і праблемы беларускай філалогіі і адукацыі: зб. навук. арт. / рэдкал.: Т. І. Шамякіна (гал. рэд.) [і інш.]; уклад. А. І. Бельскі. — Мінск: РІВШ, 2006. — 336 с.

*Матэрыялы канферэнцый*

Комплекснае даследаванне фальклору і этнакультуры Палесся: матэрыялы II Міжнар. навук. фальклорна-этналінгвіст. канф., 14—15 крас. 2005 г. / рэдкал.: В. Ліцьвінка (уклад.) [і інш.]. — Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2005. — 338 с.

Куляшоўскія чытанні: матэрыялы Міжнар. навук. канф., 26—27 крас. 2006 г. / Мін-ва адук. Рэсп. Беларусь, Магілёўск. дзярж. ун-т імя А. А. Ку ля шова; рэдкал.: А. М. Макарэвіч (адк. рэд.) [і інш.]. — Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2006. — 322 с.

*Вучэбна-метадычныя матэрыялы*

Лойка А. А. Роўнакутны трохвугольнік, або ад Палямона да Максіма Танка: дапам. па спецкурсе «Беларуска-руска-польскія літаратурныя сувязі» / А. А. Лойка; Беларус. дзярж. ун-т, філал. ф-т. — Мінск, 2003. — 214 с.

Метадычныя ўказанні і ілюстрацыйны матэрыял да правядзення фаль клор най практыкі студэнтаў І курса філалагічнага факультэта / Беларус. дзярж. ун-т; аўт.-склад. Р. М. Кавалёва [і інш.]; пад рэд. Р. М. Кавалёвай. — Мінск, 1998. — Вып. 3: Беларуская вясельная абраднасць. — 58 с.

*Інфармацыйныя выданні*

Сцяжынка ў даўніну: навукова-бібліягр. паказ. / склад. Л. А. Мазурына, Т. К. Цяпкова. — Мінск: РЦЭВД, 1995. — 27 с.

Структура і дынаміка дзіцячага чытання ў Рэспубліцы Беларусь: па матэрыялах даследавання / Нац. б-ка Беларусі; склад. Н. М. Касілава, М. І. Андарала. — Мінск, 1999. — 18 с.

*Аўтарэферат дысертацыі*

Дасаева Т. М. Паэтыка лірызму ў беларускай публіцыстыцы і мастацкай прозе: аўтарэф. дыс. ... д-ра філал. навук: 10.01.10; 10.01.01 / Т. М. Дасаева; Беларус. дзярж. ун-т. — Мінск, 2002. — 39 с.

Заяц Н. В. Творчасць Васіля Зуёнка: узаемадзеянне лірычнага і эпіч на га: аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук: 10.01.01 / Н. В. Заяц; НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. — Мінск, 2006. — 21 с.

*Архіўныя матэрыялы*

Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ). — Фонд 16. — Воп. 1. — Адз. зах. 1.

Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі (ЦНБ НАН Беларусі), аддзел рэдкай кнігі і рукапісаў. — Фонд 23. — Воп. 1. — Адз. зах. 424.

**б) прыклады бібліяграфічнага апісання складовых частак выданняў**

*Складовая частка кнігі*

Тычына М. Цана прароцтваў / М. Тычына // *Чорны К.* Выбр. тв. / уклад. і прадм. М. Тычыны; камент. М. Тычыны, Я. Янушкевіча. — Мінск: Беллітфонд, 2000. — С. 3—24.

*Раздзел з кнігі*

Лойка А. А. Максім Гарэцкі / А. А. Лойка// Гісторыя беларускай літаратуры: дакастрычніцкі перыяд : у 2 ч. / А. А. Лойка. — 2-е выд., дапрац. і дап. — Мінск: Вышэйш. шк., 1989. — Ч. 2. — Раздз. 8. — С. 364—392.

Бунакова В. А. Формирование русской духовной культуры / В. А. Бунакова // Отечественная история: учеб. пособие / С. Н. Полторак [и др.]; под ред. Р. В. Дегтяревой, С. Н. Полторака. — М., 2004. — Гл. 6. — С. 112—125.

*Частка са збору твораў, выбраных твораў*

Танк М. Казка пра Музыку / М. Танк // Зб. тв.: у 13 т. — Мінск: Маст. літ., 2006. — Т. 1. — С. 162—180.

Сачанка Б. Родны кут / Б. Сачанка // Выбр. тв.: у 3 т. — Мінск: Маст. літ. 1995. — Т. 3: Аповесці. — С. 361—470.

Гілевіч Н. Перажыўшы вайну / Н. Гілевіч // Выбр. тв.: у 2 т. — Мінск: Маст. літ., 1991. — Т. 2. — С. 173—348.

*Складовая частка зборніка*

Мазанік Л. Максім Багдановіч / Л. Мазанік // Шляхам гадоў: гіст.-літ. зб. / рэдкал.: Г. Кісялёў [і інш.]; уклад. Я. Янушкевіч. — Мінск: Маст. літ., 1994. — С. 298—306.

Якіменка Т. С. Аб песенна-эпічнай традыцыі ў музычным фальклоры беларусаў / Т. С. Якіменка // Беларуская музыка: гісторыя і традыцыі: зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. акад. музыкі; склад. і навук. рэд. В. А. Ан та не віч. — Мінск, 2003. — С. 47—74.

*Артыкулы са зборнікаў тэзісаў, дакладаў і матэрыялаў канферэнцый*

Гніламёдаў У. В. Янка Купала, Якуб Колас і Сярэбраны век / У. В. Гні ла мёдаў // Янка Купала і Якуб Колас у кантэксце славянскіх літаратур: матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 3—4 кастр. 2002 г. / У. В. Гні ламёдаў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск: Беларус. навука,

2002. — С. 7—14.

Ермакова Л. Л. Полесский каравайный обряд в пространстве культуры / Л. Л. Ермакова // Тураўскія чытанні: матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Гомель, 4 верас. 2004 г. / НАН Беларусі, Гомел. дзярж. ун-т; рэдкал.: У. І. Коваль [і інш.]. — Гомель, 2005. — С. 173—178.

*Артыкул з выдання, якое працягваецца*

Чаеўская М. Эвалюцыя вобразнай сістэмы твораў К. Чорнага 20-х гадоў / М. Чаеўская // Міфалогія — фальклор — літаратура: праблемы паэтыкі: зб. навук. прац / Беларус. дзярж. ун-т, філал. ф-т; пад агульн. рэд. В. П. Рагойшы; склад. Т. І. Шамякіна. — Мінск: РІВШ, 2004. — Вып. 3. — С. 170—179.

*Артыкул з часопіса*

Верына У. Ю. Эвалюцыя паэтычнай сістэмы А. Разанава / У. Ю. Ве ры на // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педа го гіка. — 2000. — № 2. — С. 32—35.

Лявонава Е. «Не адзінокі востраў...»: В. Быкаў і сусветная літаратура / Е. Лявонава // Полымя. — 2005. — № 8. — С. 166—182.

*Артыкул з газеты*

Падаляк Т. «Яшчэ з юнацкага ўзросту пакрылі скроні серабром...» / Т. Падаляк // Звязда. — 2005. — 14 студз. — С. 7.

Галубовіч, Л. Учарашняе сённяшняе / Л. Галубовіч // ЛіМ. — 2006. — 4 жн. — С. 6.

*Артыкул з энцыклапедыі, слоўніка*

Шыкунова Э. В. Экспрэсіянізм / Э. В. Шыкунова // Беларус. энцыкл.: у 18 т. — Мінск: БелЭн, 2004. — Т. 18, кн. 1. — С. 78.

Жураўлёў В. П. Уладзімір Кандраценя / В. П. Жураўлёў, Л. І. Шырын // Беларускія пісьменнікі: біябібліягр. слоўн.: у 6 т. / пад рэд. А. В. Мальдзіса; рэдкал.: І. Э. Багдановіч [і інш.]. — Мінск: БелЭн, 1994. — Т. 3 : Івашын — Кучар.—С. 134.

*Рэцэнзіі*

Марціновіч А. Душа весніцца ад шчырай песні / А. Марціновіч // ЛіМ. — 2006. — 13 кастр. — С. 6. — Рэц. на кн.: Кустава, В. Тамсама: вер шы / В. Кустава. — Мінск: Маст. літ., 2006. — 150 с.

*Архіўныя матэрыялы*

Ліст М. Лужаніна да П. Труса // БДАМЛіМ. — Фонд 66. — Воп. 1. — Адз. зах. 1492. — Л. 3.

**Заўвага.** Пры нумарацыі навуковых крыніц пасля лічбы ставіцца абавязкова кропка. Напрыклад:

1. Гніламёдаў У. В. Янка Купала, Якуб Колас і Сярэбраны век / У. В. Гніламёдаў // Янка Купала і Якуб Колас у кантэксце славянскіх літаратур: матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 3—4 кастр. 2002 г. / У. В. Гніламёдаў (гал. рэд.) [і інш.].— Мінск: Беларус. навука, 2002. — С. 7—14.

2. Ермакова Л. Л. Полесский каравайный обряд в пространстве

культуры / Л. Л. Ермакова // Тураўскія чытанні: матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Гомель, 4 верас. 2004 г. / НАН Беларусі, Гомел. дзярж. ун-т; рэдкал.: У. І. Коваль [і інш.]. — Гомель, 2005. — С. 173—178.

3. Жураўлёў В. П. Уладзімір Кандраценя / В. П. Жураўлёў, Л. І. Шы рын // Беларускія пісьменнікі: біябібліягр. слоўн.: у 6 т. / пад рэд. А. І. Маль дзіса; рэдкал.: І. Э. Багдановіч [і інш.]. — Мінск: БелЭн, 1994. — Т. 3 : Івашын — Кучар.—С. 134.

4. Лявонава Е. «Не адзінокі востраў...»: В. Быкаў і сусветная літаратура / Е. Лявонава // Полымя. — 2005. — № 8. — С. 166—182.

**Рэсурсы электроннага доступу**

Козулько Г. Беловежская пуща должна стать мировым наследием / Г. Ко зулько // Беловежская пуща – XXI век [Электронный ресурс]. – 2004. – Рэжым доступу : http://bp21.org.by/ru/art/a041031.html. – Дата доступу: 02.02.2006.

Cryer R / Prosecuting international crimes: selectivity and the international criminal law regime / R. Cryer // Peace Palace Library [Electronic recource]. – The Hague, 2003–2005. – Mode of access: http://catalogue.ppl.nl/DB=1/SET=3/TTL=1/SHW?FRST=12/-Date of access: 04.01.2006.

Коммуникативная компетенция: принципы, методы, приемы формирования [Электронный ресурс]: сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2009. – Вып. 9. – Режим доступа: http: // www.philology.bsu.by/component/option, com_wrapper / Itemid, 85. – Дата доступа: 15.12.2009.

Трубач В.В. Асоба і метадычная творчасць настаўніка ў кантэксце духоўнага развіцця грамадства / В. В. Трубач // Актуальныя сацыяльныя і педагагічныя праблемы: разважанні і пошукі [Электронный ресурс]: зб. прабл. арт. / Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск,2009. – Рэжым доступу: http: // www.philology.bsu.by/component/option, com_wrapper/ Itemid, 85. – Дата доступу: 15.12.2009.

*Дадатак 4*

**Крытэрыі ацэнкі зместу дыпломных работ**

1. Лагічная структура дыпломнай работы: актуальнасць тэмы, практычная значнасць; мэта дыпломнай работы, яе аб’ект, прадмет, пастаўленыя задачы, структурна-лагічная арганізацыя яе зместу.

2. Абгрунтаванасць выбраных метадаў і методык лінгвістычнага, літаратуразнаўчага, псіхолага-педагагічнага даследавання.

3. Глыбіня і паўната тэарэтычнага аналізу праблемы (агляд навуковай літаратуры, выклад гісторыі пытання, абгрунтаванне логікі даследавання).

4. Якасць сабраных эмперычных матэрыялаў матэрыялаў, глыбіня, абгрунтаванасць, карэктнасць аналізу і інтэрпрэтацыі навуковых фактаў, атрыманых вынікаў.

5. Паўната, паслядоўнасць, дакладнасць і пісьменнасць выкладу зместу дыпломнай работы, якасці яе афармлення.

6. Уменне весці палеміку па тэарэтычных і практычных аспектах даследуемай праблемы, глыбіня і правільнасць адказаў на пытанні членаў ДК і заўваг рэцэнзентаў.

7. Узровень прафесійнай падрыхтоўкі выпускніка філалагічнага факультэта: валоданне тэорыяй прафесійнай дзейнасці і сфарміраванасці прафесійных уменняў.